ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# Адходы ператварыць у даходы

## Як на Міншчыне працуюць з другаснай сыравінай




**У Мінскай вобласці ў цэлым выкананы планы мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі ў адпаведнасці з рэспубліканскай праграмай. Пра гэта паведаміў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна Анатоль ІСАЧАНКА на пасяджэнні Мінаблвыканкама. Разам з тым на Міншчыне выклікае заклапочанасць стан палігонаў цвёрдых камунальных ад'ходаў. Летась падчас кантрольных праверак практычна на ўсіх выяўлены недахопы. Хаця гэтае пытанне аблвыканкам разглядаў неаднаразова і звяртаў увагу старшынь райвыканкамаў, іншых службаў на недапушчальнасць такога становішча.**

Усяго на Міншчыне эксплуатуецца 34 палігоны і 37 міні-палігонаў Летась працягваліся работы па аптымізацыі аб'ектаў захавання адходаў у сельскай мясцовасці і вывадзе з эксплуатацыі міні-палігонаў, якія не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства. Трынаццаць з іх закрытыя, у тым ліку на васьмі прайшла рэкультывацыя. Сёлета плануецца рэкультывацыя яшчэ васямнаццаці. Як адзначыў **старшыня Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр БАРАНАЎ,** найбольш частыя парушэнні эксплуатацыі аб'ектаў захавання цвёрдых камунальных адходаў — адсутнасць паслойнага ўшчыльнення або ізаляванага слоя, агароджы, нездавальняючыя пад'язныя шляхі.

Яшчэ адна праблема для цэнтральнага рэгіёна — недастатковы аб'ём вымання з цвёрдых камунальных адходаў другасных матэрыяльных рэсурсаў. Летась гэты паказчык склаў 14 %, у той час як па краіне — 18 %. Цалкам загрузіць магутнасці ліній сартавання ўдалося толькі ў Любанскім, Мінскім раёнах і ў горадзе Жодзіна. Разам з тым ступень загрузкі канвеераў на палігоне ў Барысаве складае 38 %, у Смалявіцкім раёне — 49 % пры значна большых магчымасцях.

Не менш актуальная для Міншчыны і пытанні эксплуатацыі ачышчальных збудаванняў. Аб'ём выкідаў недастаткова ачышчаных сцёкавых вод — каля 3 мільёнаў кубічных метраў штогод, або 69 % ад агульнага аб'ёму па краіне. У Фаніпалі гэты паказчык на ўзроўні 42 % ад абласнога, у Любані — 30 %. Большасць ачышчальных збудаванняў працуюць 30—45 гадоў і даўно вычарпалі свой рэсурс. У той жа час рэгён развіваецца, а сталіца будзе будаваць на тэрыторыі вобласці гарады-спадарожнікі. І з цягам часу праблема можа стаць яшчэ больш вострай.

Акрамя таго, у Мінскай вобласці налічваецца 593 нядзеючыя артэзіянскія свідравіны, на якіх павінен быць праведзены тампанаж. Патрабуюць карэкцыроўкі праекты водаахоўных зон, прыбярэжных палос, якія павінны быць прыведзены ў адпаведнасць з Водным кодэксам Рэспублікі Беларусь да 31 снежня 2020 года. Завяршылі распрацоўку праектаў толькі ў Слуцкім і Узденскім раёнах. У 2019-м на выкананне гэтых работ прадугледжана 580 тысяч рублёў для раёнаў, якія яшчэ не распачалі гэтую справу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

САДЗЕЙНІЧАННЕ ЗАНЯТАСЦІ

# РАЗГУБІЛІСЯ НА ЖЫЦЦЁВАЙ ДАРОЗЕ?

## або Шанц на працаўладкаванне павінен быць у кожнага

**Валожынская раённая газета «Працоўная слава» працягвае сачыць за сітуацыяй з працаўладкаваннем беспрацоўных грамадзян у раёне. На мінулым тыдні нашы калегі пабывалі на чарговым пасяджэнні пастаяннай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва ў рамках рэалізацыі нормаў дэкрэта аб садзейнічанні занятасці насельніцтва, што створана ў раёне.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У ім удзельнічалі кіраўнікі і прадстаўнікі розных службаў. Былі разгледжаны пратаколы, дзе адлюстравана работа з грамадзянамі па пацвярджэнні іх занятасці ў квартале, якія папярэднічаў фарміраванню базы даных. Справа ў тым, што тыя, хто фігуруе ў спісах людзей, не занятых у эканоміцы, і з'яўляецца ўласнікам жылля, з 1 студзеня павінны стапрацэнтна аплачваць кошт камунальных паслуг: гарачае водазабеспячэнне, цеплазабеспячэнне, газазабеспячэнне (пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў), што адпавядае поўнаму пакрыццю расходаў дзяржавы на іх аказанне. Перш чым прымаць рашэнне адносна асобных грамадзян, члены камісіі дэталёва разгледзелі ўсе абставіны і выключылі са спіса тых, хто меў на гэта важкія падставы.

Як адзначыў **старшыня камісіі Пётр БІБІК,** жыхары раёна актыўна звярталіся ў камісію з дакументамі-пацвярджэннямі занятасці. У першую чаргу тыя, хто працуе ці вучыцца за мяжой ці мае прысядзібны ўчастак, а таксама шматдзетныя бацькі і бацькі дзяцей, якім не споўнілася сем гадоў. У зборы інфармацыі прынялі ўдзел розныя службы. Вялікую работу ў гэтым кірунку правялі старшыні і спецыялісты сельвыканкамаў. І не дзіўна: у сельскай мясцовасці кожны чалавек на віду. Таму даведацца, чаму некаторыя нідзе не працуюць, лёгка. Многія вяскоўцы апрацоўваюць зямлю, займаюцца рамесніцтвам ці аказваюць агратурыстычныя паслугі.

Першапачаткова ў базе фігуравалі каля 2 тысяч грамадзян. У выніку праведзенай работы 1005 чалавек прызнаны занятымі ў эканоміцы. Адносна тых, хто па-ранейшаму застаецца ў спісе, работа працягваецца. На пасяджэнне, напрыклад, запрасілі чатырох жыхароў райцэнтра (патэнцыйных плацельшчыкаў), якія на працягу многіх гадоў не могуць знайсці сябе ў прафесійным плане. Прычыны такога становішча часцей за ўсё банальныя: злоўжыванне алкаголем, неаднаразовае адбыванне пакарання за тое ці іншае злачынства, лячэнне ў ЛПП. **Сакратар камісіі Марына ЮДА** заўважыла: «Нягледзячы на тое што гэтыя людзі разгубіліся на жыццёвай дарозе, мы абавязаны даць ім яшчэ адзін шанц і дапамагчы замацавацца ў адной з арганізацый, дзе ёсць вакансіі».

Напрыклад, 57-гадоваму мужчыну далі накіраванне ў РУП «Валожынскі жылкамунгас». Ён, дарэчы, ужо шмат гадоў перабіваецца часовымі заробкамі. Пасля таго як яму растлумачылі сітуацыю з аплатай камунальных паслуг, выказаў гатоўнасць афіцыйна працаўладкавацца. На жаль, далёка не кожны з тых, каму неаднойчы спрабавалі дапамагчы, цэніць гэты клопат. Іх незадаволенасць любой з прапанаваных работ наводзіць на думку пра тое, што ёсць сярод нас сапраўдныя тунеядцы. Што ж, магчыма, сумы за камуналку прымусяць задумацца...

ПРАЕКТ

# «ГОРКА!» АМАЛЬ ПРАЗ СТАГОДДЗЕ

## У Клецку плануюць узнавіць старадаўнія вясельныя строі

**У сістэме клубных устаноў культуры Мінскай вобласці 2019-ы абвешчаны годам вясельнай абраднасці. Таму ва ўсіх кутках цэнтральнага рэгіёна ў хуткім часе будуць арганізаваны даследчыя экспедыцыі па вывучэнні вясельных традыцый, выстаўкі старых вясельных фатаграфій і дзіцячых малюнкаў, перасоўныя выстаўкі вясельных убораў, раённыя агляды-конкурсы этнаграфічных калекцый.**

Клецкія культработнікі плануюць рэалізаваць амбіцыйны праект па гістарычнай рэканструкцыі адзення маладых з гэтай мясцовасці на падставе старадаўніх здымкаў, паведамляе раённая газета «Да новых перамог». Аўтары ідэі шукаюць вясельныя фатаграфіі, зробленыя да 1940 года, і просяць падзяліцца копіямі фота па электронным адрасе Klezk_gazeta@tut.by або прынесці арыгіналы ў рэдакцыю раённай газеты. У якасці ўзнагароды для тых, хто адгукнецца на просьбу, арганізатары праекта гарантуюць магчымасць убачыць і дакрануцца да дэталёва адноўленых вясельных строяў сваіх продкаў.

На здымку — адным з прэтэндэнтаў на рэканструкцыю — бацькі Марыі Пілецкай 1929 года нараджэння. Распытаць Марыю Якаўлеўну пра падрабязнасці вясельнага абраду ў журналістаў не атрымалася, бо з гадамі яна амаль страціла слых. Доўгі час жанчына захоўвае гэтае фота, што зроблена прыкладна ў 1927 годзе. Здымак выкананы ў выглядзе паштоўкі: на адваротным баку можна было напісаць адрас і даслаць поштай родным. Можна разгледзець адзенне маладых таго часу і галаўны ўбор нявесты, які складаўся з шапачкі, упрыгожаный кветкамі, а таксама кароткай па даўжыні фаты.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 31 студзеня 2019 года.**